*Да 20-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў*

# Навекі ў памяці

ІШОЎ чэрвень незабыўнага 1944 года. З усходу ўсё набліжаўся і набліжаўся гул артылерыі. Пад магутнымі ўдарамі Савецкай Арміі адкочваліся на захад гітлераўскія орды. Вораг імкнуўся вывесці з-пад удара свае асноўныя сілы, чапляўся за кожны рубеж, аказваў жорсткае супраціўленне.

Так было і на невялікай Случы, якая працякае праз Пагост. Па замініраваным мосце беглі фашысцкія салдаты. Вось-вось ён гатоў быў узляцець угору.

— Не даць ворагу замацавацца, захапіць мост! — такую задачу паставілі перад сабой танкісты малодшага лейтэнанта Беражнога.

Фашысты імкнуліся ператварыць Случ ва ўмацаваны рубеж і хоць на некаторы час затрымаць імклівы рух часцей Савецкай Арміі. На правым беразе пабудавалі дот, вырылі траншэі. Свае пазіцыі занялі кулямётчыкі, артылерысты.

Да ракі на поўным хаду імчалі нашы танкі. Першым да моста выскачыла баявая машына малодшага лейтэнанта Старыкава. Гітлераўцы вялі па танках ураганны агонь. Вядучы танк быў падбіты.

Тады чатыры танкісты: тэхнік-лейтэнант Зіноўеў, сяржанты Малароднаў, Фамічоў і Самарац выскачылі з палаючай машыны і кінуліся да ракі.

— Пераправу захапіць і трымаць да падходу асноўных сіл, — загадаў лейтэнант Зіноўеў і першым кінуўся ў ваду. За ім паследавалі астатнія.

Мост быў замініраван. Прабіраючыся ў вадзе ад палі да палі, танкісты перарэзалі шнуры, якія вялі да мін, і дабраліся да правага берага. Непадалёку быў варожы дот. Трэба было заставіць яго замоўкнуць. У ход былі пушчаны гранаты. Дот замоўк.

Вораг лютаваў. Адна за другой следавалі контратакі. Фашысты імкнуліся знішчыць танкістаў і ўзарваць мост. Тры гадзіны цягнуўся жорсткі бой, але адважныя воіны не здалі мост ворагу.

У гэтым баю смерцю героя загінуў тэхнік-лейтэнант Мікалай Анісімавіч Зіноўеў. Радзіма высока ацаніла подзвіг афіцэра-танкіста: яму было пасмяротна прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

... Жыхары Пагоста і навакольных вёсак свята берагуць памяць тых, хто прынёс ім вызваленне ад фашысцкай чумы. На магіле героя стаіць помнік-абеліск. Яго імя з гонарам носіць Пагосцкая сярэдняя школа.

Піянеры школы ўстанавілі перапіску з маці героя, яго роднымі. Яны сабралі багаты матэрыял аб жыцці і баявых подзвігах М. А. Зіноўева. На яго прыкладах школьнікі вучацца любіць Радзіму, Камуністычную партыю, свой родны край.

**М. ДУБОЎСКІ,**
**завуч Пагосцкай сярэдняй школы.**